Ніна Кавальчук

# Летуценніца



**Ніна Кавальчук**

# *Летуценніца*

*Лицом светла,*
*Душою интересна.*
*Её словам и мыслям*
*В сердце тесно.*
*Идёт легко по жизненной дороге*
*Большой Талант ,-*
*Он послан её от Бога.*

**С. А. Осовцова,**
главный специалист по оздоровлению
населения района

*«Зачароўвае ўсіх паэзія Ніны Кавальчук... Гэта сапраўдны талент, палескі крышталь. Яна не піша вершы па нейкаму плану, паэтычныя радкі нараджае прыгожая душа гэтай жанчыны.”*

**Т.А. Валуевіч,**
дырэктар Ганцавіцкай РЦБС

“Шчымлівае да болю пачуццё любові да роднага куточка, да сваіх родных і блізкіх, да людзей, сярод якіх лёс наканаваў ёй жыць, адчуванне знітаванасці з гэтай зямлёй і гэтымі людзьмі – адметная рыса творчасці Ніны Кавальчук – паэткі шчырай і ў жыцці, і ў творчасці, чалавека чулага і неабыякавага , вялікага жыццялюба і працаўніка, наогул прыгожага чалавека і прыгожай жанчыны. Кожны новы верш Ніны Кавальчук – абуджэнне тонкіх струн душы чытача, пра якія ён і сам часта да гэтага не падазраваў.

Спадзяюся, што мілагучным словам матчынай мовы паэтка будзе яшчэ доўга грэць сэрцы ўдзячных паклоннікаў яе таленту.”

**І.М. Рудкоўская,**
настаўніца Хатыніцкай сярэдняй школы

*"Як работнік – адказны, патрабавальны да сябе і да іншых....*
*Як чалавек – сціплы, добры, разважлівы, спагадлівы...*
*Як жанчына – у меру вясёлая і сур'ёзная, простая, мілая...*
*Як паэтка - шчырая, сумленная ў сваёй творчасці... Яе слова кранае душу, бо за кожным – жыццё, лёс, свая непаўторная гісторыя, свая непаўторная песня..."*

**Л.В.Бабуліна,**
дырэктар Ганцавіцкагя тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва

"Шырокае прызнанне ў чытачоў атрымала творчасць паэткі Ніны Квальчук з Хатыніч. Яе простыя, сціплыя, кранаючыя душу вершы заваявалі самую шырокую папулярнасць...

Творчасць Ніны Кавальчук даўно ўжо выйшла за рамкі самадзейнай, стала прафесійнай. Яна любіць і выдатна адчувае родную мову, дасканала валодае асновамі вершаскладання, умее і можа працаваць са словам. А яшчэ ў жанчыны - прыроджаны дар, талент, які, як вядома, ні ў кога не пазычыш і нікому не перадасі. Ніна таксама валодае ўменнем бачыць свет сваімі вачамі, у вобразах і непаўторных фарбах, лаканічным радком перадаць свой пякучы боль, развясёлую радасць, самыя патаемныя пачуцці. Напісанае Нінай Кавальчук даўно просіцца ў кніжку."

**К.К. Мохар,**
журналіст, лаурэат прэміі "Залатое пяро"

## Летуценніца

Цёмнай ноччу прыходзіў ты ў сны
З цеплынёю, пяшчотай і ласкай.
Ты прыносіў пачатак вясны,
І жыццё мне здавалася казкай.
Летуценніцай, мусіць, была,
Бо і ў марах сваіх да світання
Я пад ветразем белым плыла,
Каб сустрэць тваё, любы, каханне.
Праляцелі юнацтва гады,
Ім назад не вярнуцца ніколі.
Зноў квітнеюць навокал сады,
Зноў жыты весялеюць на полі.
Пахне росна чаромхай з лясоў.
Першы гром над бярозкай грукоча.
І на крылах зялёных вятроў
Адлятае мой смутак дзявочы.
**1979г.**

## Запознены пацалунак

Успаміны вярэдзяць сэрца,
Калі бачу я гэты завулак.
Паўстаюць тваіх воч азерцы,
Твой запознены пацалунак.
Аб ім марыла я тады,
Як у хоры мы школьным спявалі.
Ты ж прынёс мне яго праз гады,
Калі вусны чакаць перасталі.
Майго сэрца ўжо не кранаў
Шэпт гарачы прызнання ў каханні.
Ты дзяўчат кожны вечар мяняў,
У снах ішоў да мяне на світанні.
У душы маёй холад завей.
Адчуваю адно шкадаванне.

Ты спазніўся. Каб крыху раней
Мне прызначыў ты гэта спатканне.
**1979г.**

## Першынец

Гляджу ў захапленні на тварык дзіцяці,
Бо ёсць хіба большае шчасце для маці,
Чым дочку ці сына трымаць на руках
І бачыць усмешку ў дзіцячых вачах?

На рукі бяру асцярожна я сына,
Схіляе галоўку мой любы хлапчына,
Бо толькі няпоўных тры месяцы мае
І добрае моцы яму не хапае.

Упарціцца сын, паднімае галоўку.
На грудзі яна апускаецца зноўку.
Заплакаў маленькі - ад крыўды няйначай,
Ды толькі паможаш хіба гэтым плачам?

Шкада мне майго небараку –сыночка,
Цалую гуллівыя ямкі на шчочках,
Цалую я пальчыкі, носік кірпаты,
І роцік ружовенькі,
І вачаняты...

Заснуў, а на вуснах усмешка блукае.
Старыя гавораць: “Анёл забаўляе”.
Хай сняцца сыночку да самага ранку
Светлыя сны пад маю калыханку.
**1981г.**

## Вяснушкі

Ванюшку цэлых шэсць гадоў
І хутка ўжо за парту,
Таму ён гэтак ручніком
Свой тварык трэ ўпарта.
Твар ад старання аж гарыць
І не стрымала маці:
"Ну, колькі можна яго мыць?
Бяжы, чакае брацік".
Ды слёзы пырснулі з вачэй
Віхрастага Ванюшкі
І засвяціліся ярчэй
На тварыку вяснушкі.
"Іх не было раней ў мяне,
Хто, мама, так пажартаваў?
Падкраўся ціхенька і ў сне
Мне твар увесь размаляваў?"
Зірнула маці на малога:
"Такой бяды... Чаго панік?
Насыпаў зерня залатога
Табе на носік сакавік.
Ён залацінкі дарыць дзецям,
Каб весялей было на свеце".
**1986г.**

## Як у полі зялёным дубочкі

Як у полі зялёным дубочкі
Падрастаюць -- чытыры сыночкі.
Хоць сумнення ў душы зерне спее,
Мецы дзяўчынку люляю надзею.

Толькі б чыстае, яснае сонца
Ім свяціла заўсёды ў аконца!

Каб не бачыць у вочках іх болю,
Берагчы трэба мір нам і волю.

Мы за заўтра сваё ўсе спакойны,
Дык навошта ж нам “зорныя войны”?
І навошта нам бомбы, ракеты?..
Трэба мір усім людзям планеты!

Мы павінны за рукі ўсе ўзяцца
І за шчасце Радзімы змагацца.
Каб звінець ручайкам,
Песням  радасці ліцца,
Каб дачушка мая шчэ магла нарадзіцца.
**1988г.**

**Сямейны экіпаж**

Не даклікацца, мусіць, дадому малых,
Не загнаць  сёння зноў іх у хату,
Бо паселі ў чаканні на лаўку ўтраіх –
Са жніва сустракаць свайго тату.
А над вёскай усё болей  згушчаецца змрок,
Зоркі свецяцца ў небе бяскрайнім.
Пераконвае , чую я,  большы сынок:
- Я цябе абганю на камбайне.
- Не! Не-не! – запярэчыў сярэдні яму,
І ад крыўды дрыжыць яго голас.
Падыходжу, ласкава да сэрца гарну:
- Супакойся, маленькі мой голас.
Хіба ж важна,сынок, хто абгоніць каго?
Не за славай павінны  вы гнацца.
Для мяне, як для маці, важней усяго,
Каб сумленнай была ваша праца.
Хопіць вам, мае хлопцы, шчэ ніў залатых,
І ад працы пазнаеце стому.
Так, як тату цяпер, буду вас маладых

Кожны вечар чакаць я дадому.
А цяпер, “хлебаробы”, пара ужо спаць.
Заўтра ў садзік, а маме на працу.
Самы  меншы “камбайнер” заснуў на руках,
Хай жа  сны яму светлыя сняцца.
Прахалодаю  цягне з нізін і лясоў,
Тушыць ноч вокны  жоўтыя ў хатах,
Засынае спакойна сямейства маё.
Я адна дачакалася  тату.
**1988г.**

## Мова роднай хаты

Лупцавалі не раз беларуса – скарыся!
І турмою палохалі пан і паняты.
Толькі лепей застацца без волі і хаты,
Чым ад мовы свае адрачыся.
А над намі цяпер плётка пана не свішча.
Толькі з мовы сваёй робім мы папялішча...
На каго крыўдаваць і вініць каго будзем,
Калі матчыну песню мы страцім, забудзем?
Супраць рускае мовы нічога не маю,
Галаву перад ёю я нізка схіляю.
Але ёсць на зямлі край да болю  любімы,
Толькі ў ім па-сапраўднаму будзеш шчаслівы.
Дык, скажыце, чаму ў гарадах  беларускіх
Большасць надпісаў-шыльдаў чамусьці па-руску?
Быццам роднае мовы зусім там не маюць,
Як замежную , у школах яе вывучаюць.
Калі чэсна, то толькі ў мясцінах вясковых
Чуем мы мілагучную родную мову...
Але едуць у горад вучыцца дзяўчаты
І з сабой не бяруць мову роднае хаты.
Бо прызналі яны: не прэстыжна, не модна
Везці ў Мінск яе, Віцебск, у Брэст альбо Гродна.
У вучылішчах, школах, у садзіках новых,

Не пачуеце  вы свае роднае мовы.
Бо, усхваляючы  любы свой край  беларускі,
Усе пішуць, чытаюць  чамусьці па-руску.
Мова родная ўсім нібы падчаркай стала,
Быццам людзям яе шчырых  слоў не хапала.
...Калі крылаў няма – не ўзляціць  увысь бусел,
Калі мовы нама – няма нас, беларусаў.
**1988г.**

## Маленства

Маленства майго малюнак
Памяць ніяк не міне –
Ліпкаю глінай  матуля
Мажа пазы на сцяне.
Рукі старанна і  ўмела-
Ім невядомы спакой -
Пэндзлем  рухавым пабеляць
Печ і дашчатую столь.
У працы, каб менш заміналі
(А гэта мы можам гуртом),
На цёплы чарэн нас загналі
Пагрэцца там разам з катом.
Яшчэ не прасохла падлога,
Дзе шчыра стараўся дзяркач,
Зашлёпалі босыя ногі –
Бяжым  па пакоях ускач.
Прыгожа, спакойна, утульна
У хаце маленства майго.
Там нас калыхала матуля,
Там многа спазналі ўсяго.
…Цяпер жа і ў бацькавай хаце
На новы ўсё зроблена лад.
І столі не беліць больш маці,
Як многія вёсны назад.
Пад моднай сухою тынкоўкай

Надзейна схаваны пазы,
І толькі пад столлю з вагонкі
Вісяць, як раней, абразы.
**1988г.**

## Чацвёра сонейкаў маіх

Сем гадоў назад упершыню я стала маці
І цешылася сынам дзень пры дні…
А ўжо смяюцца, бегаюць па хаце
Чацвёра ясных сонейкаў маіх.
Сур'ёзны Коля і смяшлівы Дзімка,
Максім- гарэза і маўчун-Віцёк.
Звініць удзень, увечары і ўранку
Іх галасоў вясёлы ручаёк.
Гады ідуць. Гадам няма супынку,
І не заўважым з татам удваіх,
Як вырастуць між класных перапынкаў
Чацвёра ясных сонейкаў маіх.
Спачатку Коля, а за Колем -- Дзіма,
Максім-гарэза і маўчун-Віцёк.
І будзе крыху сумна і тужліва,
Што іх не трэба адпраўляць на ўрок.
Настане час аддаць свой доўг салдата –
Глядзім з надзеяй на сыноў сваіх,-
Пад "Марш славянкі" правядзём мы з татам
Чацвёра ясных сонейкаў маіх.
Махне рукою Коля, потым Дзіма,
Максім – гарэза і маўчун-Віцёк.
Хай будзе, дзеткі, служба вам шчаслівай,
Хай сніцца вам бацькоўскі наш парог.
Адслужаць хлопцы і дамоў вярнуцца,
Хто паасобку, хтосьці мо ўдваіх.
І па-мужчынску скупа ўсміхнуцца
Чацвёра ясных сонейкаў маіх.
Жывіце доўга:Дзімка наш і Коля,

Жывіце чэсна: Віцька і Максім.
Жывіце так, каб не паліў нас сорам,
Каб смела ў вочы мы глядзелі ўсім.
**1988г.**

*   *   *

Жыццё нясе нас, як рачная плынь,
Віруе-круціць, бы ў вадавароце,
А недзе засталася неба сінь
І сонечныя зайчыкі на плоце.

Мне скажуць, што і сёння гэта ёсць,
Спрачацца, пэўна, тут ужо не будзеш.
Але маленства, як  жаданы госць,
Яго, як не старайся, не забудзеш.

Цяпер здаецца, што раней было
Усё намнога прыгажэй і лепей.
Дзіцячых сэрцаў ласка і цяпло
Патрэбны нам , як  парасткам у глебе.

Як хочацца вярнуцца хоць на дзень
На той далёкі астравок дзяцінства.
Сіней там неба, поле зеляней,
Там многа сонца, радасці, адзінства.

Мы прабяжымся  толькі хіба ў снах,
Па тых знаёмых, блізкіх нам узлесках.
Дзе веснавы чакае нас размах,
Зямля ў пяшчотных красачках-пралесках.

Жыццё нясе нас, як  рачная плынь,
На хвалях мы трымаемся  няўмела.
Як хочацца, каб неба таго сінь
Была заўсёды з намі, не цямнела.
**1994г.**

*   *   *

Квітнеюць сады. Позірк нельга адвесці
Так зачароўвае іх прыгажосць.
Ветрык лагодна цалуе іх, песціць,
Хутка асыплецца долу суквецце,
Бо і ў прыродзе вясна толькі госць.
Так і ў нас, у людзей , адцвітае
Песнямі, смехам юначым вясна.
Дні, як пялёсткі, жыццё асыпае,
Часам камусьці тых дзён не хапае
Выпіць свой кубак вясновы да дна.
Чымсьці жыццё мне ў прыродзе прывабней,
Можа, што скончыцца год непрыкметна.
Зноў зацвітуць у садах нашых яблыні,
Быццам нявесты прыгожыя, зграбныя,
І прынясуць з сабой цёплае лета.
Шлях чалавечы даўжэйшы намнога.
Толькі прыходзіцца сэрцу скарыцца,
Вядзе ўсё далей ад юнацтва дарога.
Ды знаю, за самым апошнім парогам
У нашых нашчадках вясне паўтарыцца.
**1994г.**

*   *   *

*Прысвячаецца першай настаўніцы*
*Лятун Алене Іванаўне*

Дзесяцігоддзі з той пары прайшлі,
Як жнівеньскім лагодным, цёплым ранкам.
Да хаты дзве дзяўчынкі падышлі
І запыталі весела на ганку:
“Ці тут жыве дзяўчо сямі гадоў?
Пара, напэўна, у школу ўжо збірацца...”
І кліча маці: “Нінка, дзе ты зноў?

Цябе ніколі ў час не дагукацца!”
Збянтэжаная выйшла я да іх
І сарамліва апусціла вочы.
“Ну, выбірай каго вось з нас дваіх
І да каго у клас ты запісацца хочаш?”
Зірнула я: жартуюць, а ці не,
Глядзяць сур’ёзна, а ў вачах смяшынкі.
Ну, пэўна не, пацяшаюцца з мяне-
Вясковай, басаногае дзяўчынкі.
“Вось гэтая, напэўна прыгажэй” –
Я смела ткнула пальцам ёй у грудзі.
“Ну, вось і добра. Падыдзі бліжэй,
Цяпер з табой знаёміцца мы будзем”.
Так з першаю настаўніцай сваёй,
Сустрэлася я на бацькоўскім ганку.
...І першынца таксама вяла ёй
Па волі лёсу вераснёўскім ранкам.
**1994г.**

* * *

*Прысвячаю Хатынічам…*

Можа, недзе ёсць вёскі яшчэ прыгажэй,
Нам не хопіць жыцця, каб усе абысці.
Ды за нашы Хатынічы ўсё ж даражэй
І мілей, і бліжэй нам нідзе не знайсці.

Можа, у вёсках чужых людзі лепей жывуць,
Ды такіх вышыванак, я знаю, няма.
І нідзе так прыгожа не вяжуць, не ткуць,
Як у нашых гасцінных і цёплых дамах.

І адзенне адметнае ў нашых жанчын,
Бы вясёлкі, на іх каптаны і спадніцы,
А адкуль мы – з тутэйшых ці іншых мясцін,
Пазнаюць нас па “оканню” мовы-крыніцы.

Паглядзіце на нашых бабуль і матуль,
Ім сучаснае моды не трэба.
Не прызналі яны яшчэ сумак, пакуль –
Ходзяць з торбай кужэльнай  за хлебам.

Назвы вуліц на сходзе рашылі змяніць,
Каб было больш культурна.
Згаджаліся самі.
Ды ў народзе  яны засталіся ўсё ж жыць
“Касмачамі”, “Багоўкаю” і “Крупанямі”.

І што б нас  не чакала, мы будзем заўжды
Ганарыцца сваёю малою Радзімай.
Праляцяць тут у вёсцы ўсе нашы гады
І зялёныя леты, і белыя зімы.
Можа, недзе  ёсць вёскі яшчэ прыгажэй,
Ды няма за Хатынічы нам даражэй.
**1995г.**

* * *

Спякотнае, млоснае лета,
Так вабіць людзей густы цень.
Купалле ўжо ў песнях адпета,
У нябыт адышоў Пятроў дзень.
Такім вось  якраз надвячоркам
Прывезлі цябе год назад.
Насустрач нам з пашы кароўкі
Вярталіся мірна  і ў лад.
Шафёр адчыніў толькі дзверы
І шуснулі хлопцы на двор.
Гарэзам – у поўнай ім меры
Патрэбен вялікі прастор.
А ты затрымалася трошкі,
Глядзіш усхвалявана на нас.

Не бойся, дачушка, тут ножкі
Твае прабягуць  шчэ не раз.
І ты прашаптала: “ Я дома...”
На сцежку рашуча ступіла.
У блакітнай сукеначцы новай,
Што я ў падарунак купіла.
Ёсць у цябе  цяпер хата
І нават два дні нараджэння,
Ёсць брацікі, мама і тата,
Дай  Божа, нам усім разумення.
...І вось ужо год непрыкметна
Мінуў з тае першай сустрэчы.
Глядзіш ты  ласкава і ветла,
Бы ў той  даўні ліпеньскі вечар.
У адно нашы сэрцы зліліся,
І наша ты ўжо назаўсёды.
Зрадніліся мы і зжыліся,
І дзелім пароўну нягоды.
Ты стала дзяўчынкай вясковай,
Нібы не была гарадскою.
Мясцовай хатыніцкай  мовай
Ужо размаўляеш са мною.
**ліпень, 1995г.**

*   *   *

Не ведаю, чаму беспамылкова
Цябе заўсёды з іншых вылучала,
Была з табой маўкліваю размова,
Бо літары ніводнай я не знала.
Не мог спыніць халодны мяне вецер,
Што гнуў галінкі вішань, бэзу, мяты,
Я забывала пра ўсё на свеце,
Убачыўшы паштарку каля хаты.
Не ведала ні “Зорьки”, ні “Бярозкі”,
І "Пионерской правды» не чытала.

Цябе ж, мая “раёнка”, я заўсёды
Сярод выданняў іншых пазнавала.
Смяялася я радасна і звонка
І беражліва бацьку цябе несла.
«Вось, тата, глянь, твая прыйшла “раёнка”.
Ён папраўляў: “Савецкае Палессе”.
Ты для мяне, як памяць пра маленства,
Знаёмая сцяжынка ў росным полі.
Як добра, што не мела падабенства
Ты з іншымі газетамі ніколі.
Прайшлі гады. І вось пішу я вершы
І вольны час праводжу за чытаннем.
Прыходзіць пошта, і цябе я першай
Бяру ў рукі з ціхім хваляваннем.
Табе я ўдзячна, любая “раёнка”,
Што вершам шляху ты не засланіла,
Што падтрымала на сваіх старонках,
Каб веру ў сябе я не загубіла.
Цябе віншую з днём я нараджэння,
Няхай усе нягоды твае мінуць,
Няхай з табой павага і натхненне
Ідуць заўсёды поруч, не загінуць.
**1995г.**

* * *

**Кніга ў хаце – сябар,а негосць**

Хацела ціха вышмыгнуць я з хаты
Ды ўсё ж паспела маці затрымаць,
Адводжу ўбок я позірк вінаваты,
Зноў не ўдалося кнігі памяняць.
Ты лепш глядзі малых, рабі ўрокі,
А кнігі занясеш пасля Пакроў.
Мне з агародам гэтулькі марокі,
Дакорліва даводзіць маці зноў.
Пакрыўджанымі зіркаю вачыма,

Ды толькі ў маці клопаты свае.
Сказала, злосна грукнуўшы дзвярыма:
“Ну што тваё чытанне мне дае”.
Стрымаць сябе я больш і не спрабую,
Патокам слёзы хлынулі з вачэй.
Я помсліва пакрыўдзіла малую –
З сястрою плакаць удваіх лягчэй.
Гучаць у сэрцы струны-адгалоскі
Майго дзяцінства даўніх тых гадоў.
“Чаму не спіш? Глухая ноч над вёскай”,
У маім юнацтве маці кажа зноў.
Ты лепш бы вышыванне ўзяла ў рукі,
Падумаць пра пасаг даўно пара.
Карысць якая ад твае навукі,
Ляжыць во кніжак цэлая гара.
Як непісьменнай зразумець матулі,
Што ў кніжках гэтых - цэлае жыццё,
І так цудоўна з імі , так утульна,
Што абуджаюць шчасця пачуццё.
Зусім не важна, хто ты, дзе працуеш,
Калі любоў да кнігі ў сэрцы ёсць,
Калі ты слова роднае шануеш,
То кніга ў хаце сябар, а не госць.
Я сёння вольных мала хвіляў маю,
Ды ўбок адклаўшы ніткі і пруткі,
Сама ў бібліятэку завітаю,
Каб прачытаць чароўныя радкі.
**1996г.**

## Вясна 1986года

А  сонца залівала наваколле,
Зрываў з вяровак вецер паўзункі.
І немаўля ў калысцы на прыволле
Гуляць павезлі большыя сынкі.

Загушкалі – залюлялі малога,
Дзіцячым гульням – самая пара.
Я наўздагон сказала хлопцам строга –
“Не бегайце далёка ад двара”.

Усюды маці мрояцца  няшчасці,
Бо з дзецьмі  недалёка да бяды.
Каб хоць іх бокам абышлі напасці,
Каб іх не страціць ад агню, вады.

Зайшоў у двор  работнік сельсавета -
“З вяровак лепш бялізну ты здымі.
Паслалі  папярэдзіць вас пра гэта.
Аварыя. Дзяця ў  пакой вазьмі.

І большых дзетак забяры ў хату.
А не, дык хоць панамкі ім надзень.
Табе тлумачыць, што такое атам
Лічу я лішнім. Ясна ўсё як дзень”.

А дзень быў  ціхі, сонечны і мірны,
О,Божа, што ён тут нагаварыў?
Чарнобыль нейкі, пыл радыяцыйны,
Чацвёрты блок... рэактара  ўзрыў...

Але пры чым тут паўзункі і дзеці?
Ніяк не ўцямлю, ад чаго ўцякаць?
Што нам прынёс ты, красавіцкі вецер,
Якой бяды цяпер усім чакаць?

Я ў кнігах ліхаманкава шукала
Усё, што мне паможа зразумець
Пра стронцый, цэзій... Гэтая навала
Нясла ў сабе хваробы, слёзы, смерць.

Ды як жа так? Няўжо нам гора мала?
І Бог чамусьці не адвёў бяды.

Нам лейкаміі толькі не хапала
Забруджаных паветра і вады.

Гады ішлі. Мы верылі адчайна-
Бяда міне, у нас жа “ чысты” фон.
Нябачны вораг вёў работу дбайна
І выганяў людзей са “шкодных” зон.

Нябачны вораг, што страшней бывае?
Прывыкнуць немагчыма да яго.
Хоць з-за вугла ў нас ён не страляе,
Ды ад яго чакаць можна ўсяго.

Ад выбуху на станцыі далёкай
Вядзём адлік “чарнобыльскіх” падзей.
І ў гэтым годзе сын мой каравокі
Адзначыць першы круглы юбілей.

Такая доля нашай Беларусі –
Удары лёсу на сябе прымаць.
Вяртаецца з краёў далёкіх бусел
З сяброўкаю – вясну тут сустракаць.
**1996г.**

## Паездка ў горад

Я сябе ўспамінаю дзяўчынкай малой,
Упрасіла я маці з сабой мяне ўзяць.
І бягу побач з ёю ў сукенцы старой,
Бо абноўкі ж яшчэ толькі будзем купляць.

Я баюся згубіцца ў натоўпе людскім,
Толькі сорамна ўзяцца за матчыну руку.
Я пужліва гляджу на патокі машын,
Гарадскую цярпліва праходжу навуку.

Хутка мне пачынае балець галава,
І здаецца паветра чамусьці там мала.
Мне ўжо горад нямілы. Дзе ж тая трава,
На якую б я з радасцю ніцма ўпала?

І абноўкі мяне не цікавяць зусім,
І вітрына з прыгожаю лялькай таксама.
Я ўмольна на маці гладжу: ну, калі,
Ну калі ўжо дадому паедзем мы, мама?

Я змарылася ў горадзе - тлум, духата,
Дзе ж знаёмая сцежка дадому?
Там, у вёсцы, такая цяпер любата,
А тут мука, якой не жадаеш нікому.

...Даўно вырасла я ды гадамі бліжэй
Горад мне не зрабіўся.Даволі.
Стала вёска яшчэ для мяне прыгажэй,
Не змагу я ёй здрадзіць ніколі.
**1996г.**

**“Глядзіцца ў люстэрка жанчына...”**

Нялёгка застацца жанчынай
У цяжкі, складаны наш час.
Быць вартай увагі мужчыны
Хацелася б кожнай із нас.

Шанцуе, калі спадарожнік
Сустрэнецца добры ў жыцці,
А не – дык як босай па пожні
Прыходзіцца з мужам ісці.

Глядзіцца ў люстэрка жанчына,
Падлічвае вёсны свае,
На стан яшчэ быццам дзяўчына,

Ды шчасця ў вачах не стае.

У клопатах вечных, без ласкі
Прыгожы губляецца твар,
І ўжо не памогуць ні маскі,
Ні модны заморскі адвар.

У жыцці ёй не рыцар сустрэўся,
Гатовы з плячэй цяжар зняць.
Цяплом яе сэрца ён грэўся,
Не ўмеючы шчыра кахаць.

Глядзіцца ў люстэрка жанчына
І лічыць маршчынкі свае.
Ну дзе ж ты, сапраўдны мужчына –
Жаночае шчасце яе?
**1996г.**

* * *

Цяпер у школу ходзім толькі ў госці,
Лёс не паклаў у маленства наша мосцік,
Вядуць туды ўспаміны-сны ўпарта.
Зноў школьніцаю хочацца прачнуцца,
У клас знаёмы да сяброў вярнуцца,
Дзе кожнага сустрэне свая парта.
Забыўшыся пра модныя прычоскі,
У снах хачу я банты ўплесці ў коскі
І ў школьную сукенку апрануцца.
Хачу гуляць на шумных перапынках,
Што прабягаюць, як адна хвілінка,
Шмат аддала б я, каб туды вярнуцца.
З настаўнікаў убачыў хтосці першы,
Як я на алгебры пісала вершы.
За даўні грэх прашу мяне прабачыць,
Тады “паэткай” хлопцы ахрысцілі

І доўга той мянушкаю цвялілі.
Ніхто не мог мой шлях тады прадбачыць,
Тчэ палатно жыцця мой лёс на кроснах,
І вось мінула дваццаць зім і вёснаў,
Як баль свой выпускны мы адзначалі,
Як плакалі ў сукенках сваіх белых,
І хлопцы суцяшалі нас няўмела,
Як разам мы ўсход сонца сустракалі.
Раскідала жыццё нас па ўсім свеце,
У кожнага растуць свае ўжо дзеці,
Настала ў школе іх пара вучыцца.
Яны яшчэ ўсяго не разумеюць
І шанаваць, што маюць, не ўмеюць,
Ды сон такі пасля і ім прысніцца.
**1996 г.**

## Плача восень

Восень плача на шэрым, халодным двары,
І слязінкі дажджу мыюць шыбы акон.
Мне  самотна  ад восеньскай шэрай пары,
Непазбежнай. Такі ўжо ў прыродзе закон.

Восень я не люблю. У ёй  "бабіна лета"
Толькі вабіць мяне прыгажосцю сваёй,
Пазалотай лісця, позніх кветак букетам
І празрыстым паветрам, цяплом, сінявой.

Восень позняя сум у  душы выклікае
І настрой невядомы, паўнюткі нуды.
Вечнага лета, шкада, што  ў жыцці не бывае
І бягуць без прыпынкаў у восень гады.

Восень плача, яна хіба ў тым вінавата,
Што прыйшлося  знямоглым лісточкам дрыжаць.
Напачатку была яна шчодрай, багатай

І вось хоча зіма яе месца заняць.

І шкада мне яе. Да сябе запрашаю:
- Ты пагрэйся. Не плач больш на волкім двары.
І прабач, я даю табе, восень, што маю.
...Агонь весела ў печы сваволіць, гарыць.
**1996г.**

**Як пішуць вершы**

Пытаюцца часта, як пішуцца вершы?
Ды толькі хіба растлумачыш такое...
Народзіцца ў сэрцы аднойчы з іх першы,
Які ў далейшым пазбавіць спакою.

З’яўляюцца словы ў пакутах і болю,
А часам улады над імі не маеш,
Хаця нарадзіліся вершы на волю,
Усё перачытваеш іх, папраўляеш.

Здаецца, што ўсё дасканала. І раптам
Убачыш памылку, і словы не тыя.
Паставіла іх выпадкова і гвалтам,
Таму і стаяць яны, быццам чужыя.

А трэба душу каб і сэрца гаілі,
Каб грэлі цяплом гукі роднае мовы,
І вусны мае зноўку Бога малілі:
Пашлі мне ў радкі найпатрэбныя словы.

Пытаюцца часта, які верш найлепшы?
Ды ёсць хіба ў маці нялюбыя дзеці?
Мне блізкія ўсе, і апошні, і першы,
Хачу, каб ад іх больш  цяпла было ў свеце.
**1996г.**

**Не пакіньце мяне, словы...**

Ноч. Ды толькі заснуць не магу,
І чамусьці не пішацца зноўку.
У свайго я натхнення ў даўгу
І таму рушу з ім у вандроўку.

Дзе вы, словы патрэбныя ўсе?
Вам насустрач згубіла дарогу.
І стамляюся я пакрысе,
Адчуваю самоту, знямогу.

Зноў душу агарнуў мне адчай,
Пазайдросціла тым, хто не піша.
Спяць спакойна. Прашу, выбачай,
Божа. Ты за паэзію вышай.

Можа, талент дарэмна мне даў,
Можа іншай якой прызначаўся?
Бо чаму – хоць мяне ты абраў,-
Кожны верш мне так цяжка даваўся?

Можа іх мне не трэба пісаць,
А чужыя чытаць лепей вершы?
Даць знямоглай душы памаўчаць
І забыць іх – апошні і першы.

Божа, што я кажу, выбачай.
Хай настрой не праходзіць вясновы,
Бо цяжэйшы агорне адчай,
Калі раптам не вернуцца словы.
**1996г.**

## Бацькава сталярня

Яшчэ была без мэблі наша хата,
Хоць да ўваходзін поўнасцю гатова.
Заняў пад свой вярстак сталярны тата
Нябелены пакой у ёй часова.

У думках марыў: як заробіць грошай –
Тады майстэрню ён сабе збудуе.
Ну, а пакуль была там нам раскоша,
І толькі маці сварыцца, бядуе.

І просіць нас ад саменькага ранку,
Каб мы ў сталярню нават не ступалі
І не рабілі ў стружках больш гулянку.
Кляліся мы ды словы не трымалі

І ў гурбе пілавіння з галавою
Куляліся і я, і большы брацік.
Пасля ўцякалі ў “чыстыя” пакоі,
Каб нам лупцоўкі не было ад маці.

Больш на мяне злавалася яна:
“Якая з вамі чысціня тут будзе,
Што гаварыць пра меншых, як сама
Стаіш у пілавінні ўся і ў брудзе.

Зноў стружкі па ўсёй хаце разняслі,” –
І з крыўдаю падлогу падмятае. –
“Во, колькі смецця зноў мне прынясли”,
І злосна на нас венікам махае,

Маўчала я, быць не магло іначай,
Сябе я адчувала вінаватай
І марыла з упартасцю дзіцячай,
Што больш не будзе сталяром наш тата.

Вунь, як сусед, хай быў бы трактарыстам,
Вазіў бы нас з сабою ў кабіне,
Было б у хаце хораша і чыста,
І не ляжалі б стружкі, пілавінне.

Але тады ўзяла б я дзе фігуркі,
Што пахнуць лесам, хвояй і смалою?
На аканіцах бацька ўжо карункі
Не выразаў бы пілкаю ручною.

Жыцця без гэтых цацак не ўяўлялі,
Не ведалі пра лялькі і машынкі,
Палацы ўсё з розных дошчачак складалі
І такраслі мы – хлопчыкі, дзяўчынкі.

З тае пары гадоў прайшло нямала,
Даў талент свой сынам мой бацька ў рукі.
З фігуркамі цяпер, як я, бывала,
Гуляюць мае дзеці –яго ўнукі.
**1997г.**

* * *

Салодкі сон у дзяцінстве раніцою,
Ды ў гэты дзень я больш і не засну:
Брат будзе сёння няньчыцца з сястрою,
Нам трэба з мамай рваць дзялянку льну.
Я хутка памагаю ёй збірацца,
Каб не забыцца хоць, што трэба ўзяць.
Яшчэ паспею дома нагуляцца,
А сёння трэба маці памагаць.
Апошнім гарам “Беларусь” дыхне,
Звініць у шчырай песні падгалосак,
З прычэпа злезшы, з торбай на спіне,
Жанчыны крочаць да сваіх палосак.
І я іду, рукой лаўлю сцяблінкі,

А маці метку на мяжы шукае,
Змяніліся знаёмыя мясцінкі,
Бо час навокал хутка ўсё мяняе.
Блакітным было поле , як у сне,
А сення шуміць мора залатое,
Раз-пораз глядзіць маці на мяне,
Ці не адстала дзеўчаня малое.
...Бярэм мы жменяй пругкія сцяблiны,
Дзе лён палеглы, маці рве сама,
Мне пакідае роўныя мясціны;
Я крыўджуся, хоць бачу, што дарма.
Куды ні глянь, хусціначкі бялеюць
Вясковых баб, такіх, як я, дзяўчынак.
Ужо і рукі стомлена нямеюць,
І хочацца ў цянёк на адпачынак.
Пячэ нясцерпна сонца, дыхаць цяжка,
І перавяслы жорстка колюць рукі,
Хачу я піць, ды ўжо пустая пляшка.
Не вытрываць мне больш такое мукі,
Прылегла я пад цень сцяблін высокіх,
Заснула, не паспеўшы і прысесці,
Плыла я ў сне на воблаках далёкіх,
І не магла прачнуцца нават есці.
Я найшчаслівай раніцай была,
Угаварыўшы маці ўзяць з сабою,
Вось толькі б заўтра зноўку не ўзяла,
Лепш я ўжо буду няньчыцца з сястрою.
**1996г.**

*Урачам Мінцам прысвячаецца...*

Ці то праўда гэта, можа пагалоска-
Ды бабы вестку хутка разнясл і:
Прыехалі ўрачы да нас у вёску.
Каб дзеці ўсе здаровымі раслі.
Прыгожыя, казалі, маладыя,

Дачушка гадавалая ў іх,
І жартавалі голасна  старыя:
Мо недзе ў нас расце ўжо і жаніх.
Я толькі замуж выйшла той вясной,
Наперадзе -- чатыры немаўляці.
Вяртала мне надзею і спакой
Дзіцячы  ўрач, як і для кожнай маці.
Бяда, хваробы час не выбіраюць,
Прыходзяць нечакана  ўдзень і ўночы,
І паратунку ўсе у вас шукаюць,
І запытальна вам глядзяць у вочы.
Няхватка лекаў, але ж цеплыні
І разумення вашага хапае,
Пад націскам  душэўнай дабрыні
Хвароба адступае і мінае.
Гадоў семнаццаць лечыце  ўжо нас.
У вас дачка другая падрастае.
Як кажуць людзі: у добры дзень і час,
Няхай няшчасце дом ваш не кранае.
**1997г.**

**Землякам**

Ад майскіх дзён да восеньскіх дрыготкіх
Рупліва працавалі на зямлі.
І летні дзень здаваўся вам кароткім,
Ракою вечнай клопаты плылі.

Ды першы снег прынёс вам адпачынак,
Палёгку спрацаваным даў рукам.
У працы хоць маленькі перапынак
Зіма зноў клапатліва дарыць вам.

Бо хутка зноў заззяе ярка сонца
І пабягуць да рэчак ручайкі,
І будзе віцца нітка спраў бясконца,

Якія вас чакаюць – землякі.

Жыве хай радасць і не толькі ў марах,
Святло надзеі хай гарыць ярчэй.
Хачу ўсмешкі бачыць я на тварах
І позірк зацікпаўленых вачэй.

Няхай жаўрук спявае ў блакіце,
Каб за вадой нягоды ўсе сплылі.
Няхай растуць валошкі ў спелым жыце –
На песеннай  хатыніцкай  зямлі.

Нам не спыніць ракі жыцця вірлівай,
Ды ёсць і ў ёй спакою астраўкі.
Жадаю долі лепшай і шчаслівай,
Дабра жадаю вам я – землякі.
**1998г.**

## Так не глядзі

Лаўлю ізноў я позірк твой аднойчы,
Ды ў сэрцы месца для цябе няма,
То быў юнацтва эпізод звычайны,
Які дасюль ты не забыў дарма.

Не ведаю, хто болей вінаваты,
Ды толькі склаўся лёс у нас такі,
Ішоў так доўга да маёй ты хаты,
А трэба было сцежкай, напрасткі.

Цябе ўжо мае вокны не сагрэюць,
З каханым шлях жыццёвы я дзялю,
Ды вусны пры сустрэчы зноў нямеюць,
"Так не глядзі", - у думках я малю.

Няўжо пакут сумлення мне жадаеш?

Але ж віны не адчуваю я.
Ідуць гады, на іх ты не зважаеш,
Забыўшыся, што я ўжо не твая.
**1998г.**

* * *

Цнатліва бялее сшытак,
Нямыя глядзяць лінейкі.
Не ведаю, ці адбітак
Убачу на іх я нейкі?

А можа ніводнага слова
Мне запісаць не ўдасца,
Мо, здрадзіць паэзіі мова,
Да іншых паэтаў падасца;

І ўсё, што жыве ў маіх думках,
Прыхованым застанецца
У нейкіх таемных клунках,
У самым куточку сэрца?

І думка з якімсь непакорам
Пайшла па лінейках пеша.
Няхай не бялеюць дакорам,
Адчуюць прысутнасць верша.
**1999г.**

## Бярозкавыя мары

Плывуць аблокі над прыціхлай вёскай,
Кудысьці іх халодны вецер гоніць,
Плывуць над полем з тонкаю бярозкай,
Яна аб чымсьці шапаціць, гамоніць.
Мо, летнія ўспомніла світанкі

І зоркапады жнівеньскай парою,
Спатканні прызначалі тут каханкі,
З ёй радасцю дзяліліся сваёю.
Іх ад дажджу хавалі і спякоты
І сведкаю была ўзнёслых мараў,
А часам замаўкала ад самоты
Пад цяжарам зласлівых цёмных хмараў.
І як тады хацелася зялёнай
Сарвацца з месца хоць бы на імгненне
І прыхінуцца да гарэзы-клёна,
Адчуць яго гарачае трымценне.
Ды ведала, што гэтага не будзе,
Ніколі ім на ўзлеску не сустрэцца.
Быць разам, пэўна, могуць толькі людзі,
І хто сказаў: «Не маюць дрэвы сэрца».
Туманамі ахутаная вёска,
Па небу ўжо плывуць цяжкія хмары.
Глядзіць на іх самотная бярозка,
Хаваючы глыбока думкі-мары.
**1999г.**

* * *

Хтосьці з мудрых сказаў, свайго поспеху зняўшы плады:
Маладосць – гэта цуд, які з часам бясследна праходзіць.
Час чакаць не прымусіць, бягуць безупынна гады,
Незаўважна для кожнага старасць і немач находзяць.
Чалавеку лягчэй па жыццёвых дарожках ісці,
Калі побач заўсёды знаходзяцца блізкія людзі.
А калі адзінокі, няма каму ў хату зайсці,
Хто ж тады дапаможа і думаць пра старасць іх будзе?
Для такіх вось людзей у раёне ўжо многа гадоў
Ёсць аддзел сацыяльнай падтрымкі і цёплага слова.
Сацработнікі купяць прадукты і выпішуць дроў,
Мо, камусьці патрэбны лякарствы, урач тэрмінова.
Іх ля вясніц сустрэнуць: пісьмо трэба зноў адпісаць,

Дзесьці ў блізкім замежжы жывуць іх крывіначкі-дзеці.
І папросяць: прысядзь, бо няможна ў парозе стаяць,
Раскажы мне, старой, што чуваць і што новага ў свеце.
Ім патрэбна спагада і крыху людской дабрыні,
Што раней аддаваў чалавек, пэўна, потым знаходзіць,
І не трэба для іх шкадаваць нам сваёй цеплыні –
Маладосць – гэта цуд, які з часам бяследна праходзіць.
**1999г.**

* * *

Цікаўным ведаць патрэбна болей:
«Напэўна плацяць за вершы многа»,
Мяне цікавіць не кошт, а тое,
Якая трапіцца ім дарога.
Даўно вядома: паэты – бедныя,
Ніхто не мае вялікіх грошай.
Усё багацце – капейкі медныя
І тыя часам для іх раскоша.
У кожным творы душа паэта.
«Задарам болей – і не пішы».
Ну, што дарадцам сказаць на гэта,
Ці ж можна вызначыць кошт душы?..
**1999г.**

**Сынок мой…**

Мой першынец, мой хлопчык цёмнарусы,
Мінуў прысягі ўрачысты час.
Будзь верным абаронцам Беларусі,
Яна, як маці, думае пра вас.
Сынок мой храбры, хлопчык цёмнавокі,
Збылася мара даўняя твая.
І парашутаў белыя аблокі
Цябе люляюць, як калісьці я.

Сынок мой родны, хлопчык лёгканогі,
Не пакідай сяброў ты ў бядзе,
Бо як бы ні мяняў шляхі-дарогі,
А здрада да цябе ўсё ж прывядзе.
Сынок мой любы, хлопчык летуценны
Нялёгка, адчуваю, службу несці.
Хай парашут, як родны дах і сцены
Цябе заўжды ратуе, неба песціць…
Мой першынец, мой хлопчык  пасталеўшы,
Шкада, дзяцінства хутка так знікае.
Служы, мой родны, будзь адным  ты з лепшых,
Мы ганарымся, любім і чакаем.
**1999г.**

**Вясна**

Сняжынкі ў чысцюткім паветры
Свой вальс развітальны танцуюць.
Ды пахне вясной ўжо ветрык,
Праменьчыкі  сонца шчыруюць.
Кудысьці далёка-далёка
Панесліся злыя завеі,
У небе высокім аблокі
Плывуць, быццам ветразь надзеі.
Здаецца, што болей ніколі
Не будзе зімы і марозаў.
І хораша нам на прыволлі
Ад белых танклывых бярозак.
**1999г.**

**Маладосць была ці прыснілася?**

Глядзіць бабуля на закаханых,
Такіх прывабных, модна  прыбраных
І бачыць сябе ў іх, ранейшую,

Красуню вясковую першую.
Маладзенькай, з яснымі  вочкамі
На спатканні бегала ночкамі,
Дзявоцтва пара бесклапотная,
Шчаслівая ды незваротная.
З любым у вэлюме абвянчалася,
Працы цяжкае не цуралася,
І дзеткі – парасткі новыя
Раслі, ёй на радасць, здаровыя.
Колькі чакала яшчэ дарог,
Ды старасць спадарыняй на парог,
Не думала ў справах пра гэта --
Журавы панеслі вясну і лета.
Абарванае лісце вятрамі
Падае-сцелецца пад нагамі,
Іней срабрысты асеў на скронях,
Моцы ранейшай няма ў далонях.
Хапіла ў жыцці дабра і ліха,
І разважае бабуля ціха:
Так доўга жыву, што стамілася,
Маладосць была  ці прыснілася?
**1999г.**

**«Хто сваю не шануе вясну…»**

Ва ўспамінах -- красуня вясна,
І гадкоў маю я толькі восем.
І бягу ўсім насустрач вятрам,
Як далёка  яшчэ мая восень.
Загадзя не прывыклі лічыць
Мы памылкі свае і сумненні.
Спадзяёмся ў шчасці пражыць,
Перад лёсам не стаць на калені.
І каб лёс не пакінуў адну,
Мы кахання цяпло ў сэрцах носім.
Хто сваю не шануе вясну-

Будзе мецць неўраджайную восень.
Вось бы тут прызадумацца нам:
Вельмі хуткі жыцця рух спрадвечны,
Дзе тут пойдзеш насустрач вятрам,
Жыць бы ціха жыццём  чалавечным.
Я рукой на няўдачы махну.
Маем часта не тое, што просім.
Хто няўдачна пакрыўдзіў вясну,
Сваю стрэне бязрадасна восень.
**2000г.**

**Вёска мая**
(песня)

Знаю, дзесьці ёсць многа прыгожых краёў незабыўных,
З імі сэрцы людскія  заўсёды былі непарыўны.
Для мяне ж няма лепей Хатыніч ваколіц знаёмых,
Я люблю сваю вёску і ўзімку, і ў кветках вясновых.

<u>Прыпеў:</u>
Вёска мая – непаўторны мой край,
Для душы і для сэрца адзіны,
Вёска мая, з табой радасць дзялю і адчай
І ўзлётаў хвіліны.
Вёска мая – летуценняў калыска,
Юначых надзей і жаданняў,
Вёска мая, ты заўсёды, як маці,
Чакаеш сустрэч – не растанняў.

Колькі буду хадзіць па зямлі тваёй любай, жаданай,
Знаю, буду заўсёды сваёй, а не госцей нязванай.
Знаю, тут і прывецяць, і скажуць мне добрае слова,
Песняй у  сэрцы жыве твая блізкая, родная мова.

<u>Прыпеў:</u>
**2001г.**

*Урачу-гінеколагу*
***Таццяне Васільеўне Буйніч***
*прысвячаю…*

Зноў вясна надышла са сваім летуценным настроем
І здаецца зіма паўзабытым, няпрошаным сном.
Ды жадаць не хачу, каб жыло сэрца зімнім спакоем,
Хай пачуццямі поўніцца, быццам рака ў крыгалом.
Вы сама, як вясна, з пастаянна ўсмешлівым тварам,
Абаяльнасць, жаноцкасць – усё гэта, пэўна, пра Вас,
Хай жа Бог дапаможа, каб збыцца ўсім вашым марам,
І хучэй хай мінае няўстойлівы змрочны наш час.
Разумеем мы ўсе, што лякарствы цяпер у дэфіцыце,
І што грошай няма, каб ад розных хвароб нас лячыць,
Ды ўсмешка ўрача, быццам майскае сонца ў блакіце,
Нас сагрэе цяплом і падорыць надзею, каб жыць.
З вамі лёсы жаноцкія быццам у адзін знітаваны,
Абысціся без вас немагчыма, упэўнена, нам.
Вы Таццяна Васільеўна, ведаю, Богам абраны
І таму ад мяне словы ўдзячнасці шчырыя вам.
**2001г.**

## Жыві, калі ласка, каханне

Як лёгка забіць каханне
У юначых ранімых сэрцах,
І зробіцца ноччу ранне,
Замуцяцца воч азерцы.

І знікнуць усмешкі з вуснаў,
І змрок на іх душы ляжа.
Нямала ўсялякіх глупстваў
Сёй-той наўздагон ім скажа.

Жыві, калі ласка, каханне,
Хай будзе ў вачах любых ззянне,

Хай усіх, каго шчасце спаткае,
Нядобрая зайздрасць мінае.

Усе людзі чуюць і бачаць,
Каханню няма прытулку.
І сэрцы ў разлуцы плачуць,
І просяць сэрцы ратунку.

У злasліўцаў адно жаданне,
Ды ім яно адгукнецца.
…Як лёгка згубіць каханне,
Як цяжка з ім потым стрэцца.

Жыві, калі ласка, каханне,
Хай будзе ў вачах
любых ззянне.
Хай усіх, каго шчасце
спаткае,
Нядобрая зайздрасць мінае.
**2000г.**

**«Сцежка-сцежачка»**
(песня)

Зелянее лісце, зелянее,
Сонейка зямлю ласкава грэе,
На мяне хлапчына азірнуўся.
Сарамліва-шчыра ўсміхнуўся.
І яго паверыла ўсмешцы,
Я сустрэла шчасце на той сцежцы.
Ведала, у выбары ўпэўніцца,
Да мяне на сцежку тую вернецца.

Прыпеў:
Ах, вузкая сцежка-сцежачка,
Хлапечая зман-усмешачка.

А сэрцу дзявочаму верыцца:
Каханне не згубіцца – вернецца.

Пажаўцела лісце, пажаўцела,
Любага кахала, як умела.
Абяцаў мне ночкай летняй, зорнай,
Што мы будзем парай непаўторнай.
Адзінока я стаю на сцежцы,
І навошта верыла ўсмешцы.
Думала ў выбары ўпэўніцца,
Да мяне ён вернецца, ён вернецца.

Прыпеў:
Аблятае лісце, аблятае,
Мой каханы іншую чакае,
Ну, няўжо маіх пачуццяў мала,
І няўжо яго не так кахала?
Ён чакае іншую на сцежцы
І яна паверыць яго ўсмешцы.
Можа, у памылцы ён упэўніцца,
Да мяне зноў вернецца, зноў вернецца

Прыпеў:

* * *

Было лёгка раней на душы,
Чыстым донца.
Ні хмурыначкі, ні дажджыначкі,
Толькі сонца.
Крыху ўзнімецца хваля мутная –
Ападае.
Свае крылы душа ізноў
Выпрамляе.
Што ж змянілася навакол?
Ды нічога.

Тое ж неба і той жа бор,
І дарога.
Ды чамусьці ўсё мутней
Тыя хвалі
Можа проста на іх раней
Не зважалі?
Слёзы, крыўды - хіба ж бяда?
Была б вера.
Падмывае жыцця вада
Душы бераг.
Ды спяшаемся, ўсё, бяжым
Мы чагосці.
Не відаць ужо і мяжы
Маладосці.
Адвучыцца б за дробязі ўсе
Хваляваццa
І даць хвалям у душы сваёй
Адстаяцца.
**2001г.**

* * *

Жыццё, пэўна ідзе ўжо на злом:
П'юць мужчыны, падлеткі, дзяўчаты.
Проста так п'юць ці блізкім назло –
Яны ж вечна ва ўсім вінаваты.

Дзе прапіску знайшоў горкі змей,
Там спакою няма ўдзень і ўночы,
Усё болей няшчасных сямей
І смуткуюць дзіцячыя вочы.

Вельмі многія з нашых жанчын,
Сіл не маючы болей змагацца
За сваіх неразумных мужчын,
Пачынаюць за чарку хапацца.

І зусім незаўважна для ўсіх
Алкаголь затуманіць ім вочы.
Стане больш і зязюль сярод іх,
І дамоў сацыяльна-сірочых.

Што далей? Трэба нешта рабіць,
Бо расплата зусім ужо блізка,
Ёсць яшчэ нам каго бараніць –
Тых, хто п'е малако ў калысках.
**2001г.**

*   *   *

Не марыла жанчына пра багацце,
А лад вяла сярод таго, што мела,
І верыла: галоўнае ў хаце
Любоў і згода, мір душы і цела.
Старалася не траціць часу марна
Яна й тады, калі была нядужай,
І служкаю зрабілася звычайнай
На пабягушках у дзяцей і мужа.
Была вясёлай, гаварлівай, шумнай,
Зрабілася нячутнай  шэрай мышкай.
І паўсядзённай мітусні той тлумнай,
І злых папрокаў ёй хапіла з лішкам.
Патухла радасць у вачах  жанчыны,
Ды гэтага ў сям’і не заўважаюць,
Няма жадання адшукаць прычыны,
Паслуг жа болей ад яе чакаюць.
Няма ім справы, што ў яе на сэрцы,
Самім жа ім  і хораша, і ўтульна.
Іх эгаізм развіўся ў  поўнай мерцы –
Не чутна слоў “каханая”, “матуля”.
Не марыла жанчына пра   багацце,
А пра пяшчоту  марыла, спагаду.

Сабе самой  чужою стала ў хаце,
Сама з сабою не знаходзіць ладу.
**2001г.**

*Свекрыві Кавальчук Фаіне Аляксандраўне*
*прысвячаецца*

Старэйшы ў Мінску мае сын куток,
Дачцэ шле маці пісьмы на Украіну,
З траіх дзяцей малодшанькі сынок
Сваёй зямлі  не здрадзіў, не пакінуў.

Змірылася, даўно  так павялося,
Бо кожны мае права жыць, дзе хоча.
Пратоптваць  сцежку ў “людзі” давялося
І ёй самой з сям’і  сваёй сірочай.

Даўно б ужо пакінула сяло,
Бо і ў яе радзіма ёсць на свеце.
Сюды калісь замужжа прывяло,
Ды муж памёр, раз’ехаліся дзеці.

Гаворыць маці з смуткам  у вачах:
“Так хочацца туды, дзе пупавіна.
Так многа ўспамінаў  па начах...
Але ж і тут мой дом, сям’я тут сына”.

На Ганцаўшчыне болей пражыла,
Ды Нёмана ёй сняцца берагі.
Куток свой родны ў сэрцы зберагла,
Да скону дзён ён самы дарагі...
**2001г.**

*   *   *

“Не дай Божа халопу стаць панам”.
Бо тады і на чыстым падворку
Будзе бруду шукаць і заганаў.
І на тых, хто дагэтуль быў родны,
Паглядзіць зверху ў ніз, рот скрывіўшы.
Ён вышэй за халопаў, свабодны...
Хто не пан, для яго будзе лішні.
І падзенецца некуды любасць,
Што раней пасялялася ў сэрцы.
Напаказ -- самахвальства. І тупасць.
Па сваёй усё мерае  мерцы.
Хто не бачыў такой яшчэ з’явы?
Паглядзець хвалько часу не мае,
Што на ім толькі пана халявы,
Па зямлі басанож ён ступае.
**2002г.**

**Душа**

Не ў ладах я сама з сабою,
Супакоіцца чым -- не знаю.
Не знаходзіць душа спакою,
Я на волю яе адпускаю.
Ды не хоча яна пакінуць
Мяне з гэткім адчаем-сумам.
Кажа: беды-нягоды мінуць
І настане час  лепшым думам.
Абураецца: як жа гэта
Быць бяздушнаю захацела
І дзе бачыла ты паэта,
Без душы ў якога цела?
**2002г.**

*   *   *

Калі сэрца агорне адчай,
Свет паблякне ў вачах навакольны,
Адно слова тваё: “Выбачай”-
І на сэрцы спакойна і вольна.

Калі выйсця,здаецца, няма
І трывога трымае ў палоне,
“Не хвалюйся,-- сказаў бы, -- дарма”--
І адступіць трывогі  бяздонне.

Калі змрочных пачуццяў сувой
Адпусціць прымушае зноў рукі,
Мне вярнуў бы пяшчотай спакой
І жыццё пацякло б без прынукі.

Калі  б нават і страціў давер
Ці папрокам пакрыўдзіў  балюча,
Папрасіў бы: “Яшчэ раз павер”.
Боль зрабіўся  б зусім не пякучым.

...Твая постаць мільгнула ў акне,
Паміж намі расчынены дзверы.
Ты паверыць не просіш мяне,
Сам сабе, пэўна, болей не верыш.
**2002г.**

*   *   *

Чэрвеньскі ліпень
Шуміць за акном.
Цемра ад хмараў
Ахутала дом.
Дзень гэты , знаю,
Запомню навек-

З'явіцца хутка
На свет чалавек.
Хто гэта будзе –
Унучка ці ўнук?
Усё не знайду я
Занятку для рук.
Гэта ж не жартачкі –
Стану бабуляй.
Меншыя дзеці
Гудуць, быццам вулей.
«Мама, цяпер мы ўжо дзядзькі і цётка.
Зноў ад маланкі
У хаце зіхотка.
Хмары з дажджом
Вецер гоніць далей.
Стала ў двары ўсё
Свяжэй, зеляней.
Глянула неба
Блакітным святлом,
Сэрца сагрэла
Таемным цяплом.
Дыск тэлефона
Кручу весялей
Зноў адказалі:
«Званіце пазней…»
**2 чэрвеня 2002г.**

* * *

Світае. Ціха-ціха ў хаце.
Стараюся нячутна я ступаць.
На тэлефонным апараце
Зноў нумар пачынаю набіраць.
Хвалююся. У каторы раз чакаю…
«Віншуем вас з унучкаю. Алё…»
«Вялікі дзякуй!» Моўчкі заміраю.

Калыша ветрык за акном галлё.
Кароткія гудкі ідуць бясконца.
Крануўся  сэрца любасці прамень.
Вось-вось  узыдзе чэрвеньскае сонца,
І будзе сёння, знаю, ясны дзень.
**2002г.**

*   *   *

Вось і сустрэліся ўпершыню.
Гляджу на ружовы тварык.
Два месяцы ў вышыню
Ляцелі малітвы-мары.
Шкада, што змарыў цябе  сон,
На вейкі прылёг, на шчочкі.
Нямала чакала я дзён,
Каб зазірнуць табе ў вочкі.
Я гладжу галоўку тваю,
У думках здароўя жадаю
І Бога пра тое малю,
І будзе ўсё добра, я знаю.
Адчула нямала трывог
І роспач душы, хваляванне.
Заўсёды была – сведка Бог –
Я сэрцам усім за каханне.
Каб ведала тату дзіця,
Каб шлюб на гады – не хвілінкі.
Што зробіш – ёсць проза жыцця.
І сталыя робяць  памылкі.
А тут маладая сям'я…
І крыва бывае, і прама.
Бывай жа, унучка мая,
Павезла далей цябе мама.
**жнівень 2002г.**

## Скразнякі

На вятры-халады шлях жыццёвы багаты.
Ды з гадамі жаданняў маіх не адняць:
Прыхінуцца б да мамы, пабегчы да таты
І ласкава бабулю з дзядуляй абняць.
Так было ўсё проста ў маленстве далёкім.
Мо пакрыўдзіць хто часам, мо дзе забаліць
Ці на дом зададуць нам задачы-урокі,
Знойдзем хутка, хто зможа праблемы рашыць.
І было так спакойна, надзейна, трывала
За бацькамі, дзядамі – падвойнай сцяной…
Ападала лістота, зіма замятала.
Мы жылі ўсе шчасліва сям'ёю адной.
Толькі раптам працяў, апаліў холад цела.
Разгубілася я ў думках: адкуль гэтак дзьме?
Азірнулася: столькі гадоў праляцела,
І адна засталася сцяна, а не дзве.
Вецер нашага лёсу віхурыць на волі,
А ў душы без радзімых людзей скразнякі.
Без бабуль і дзядуль – іх няма ўжо болей…
Слава Богу, жывуць хоць старыя бацькі.
І жахліва ад думкі: наверсе ўсё рэшана
І апошняй надзейнай сцяне не ўстаяць.
Пройме сэрца скразняк, вечным болем замешаны.
Як жа хочацца тую сцяну ўтрымаць!
Хоць няўмольны наш час і жыцця рух бясконцы,
Быць апорай вучыліся мы ў бацькоў.
Нарадзіліся нашы ўнукі пад сонцам –
Быць для іх нам сцяной ад ліхіх скразнякоў.
На гады шлях жыцця мой даволі багаты,
Ды ранейшых жаданняў маіх не адняць:
Прыхінуцца б да мамы, пабегчы да таты
І дзядулю з бабуляй ласкава абняць.
**2003г.**

**Вершам – не**

Для сябе я вырашыла: «Не!
Вершы зноў пісаць ужо не буду.
Хіба спраў сур'ёзных у мяне
Больш няма? Вось кіну і забуду».

Біравалі думкі ў галаве,
Супраць волі рыфмы ў ёй снавалі,
Адрывалі днём гадзіну – дзве
І заснуць мне ноччу не давалі.

Я гадаю: што цяпер рабіць?
Як ваду не выльеш іх пад грушу.
Бо паэткай можна мне не быць,
А вось вершы ўсё ж пісаць я мушу.
**2003г.**

* * *

Мне, бывае, гаворацць: «Навошта
Пішаш ты пра сябе гэтак шчыра?»
Прызнаюся: не так усё проста.
Хіба ж лепш жыць хлуслівай пранырай?
У душы многіх шмат слабых звенняў,
Калі шчырасць ужо не ў пашане.
Без яе ад найлепшых памкненняў
Застаецца адно толькі званне.
На душы і няўтульна, і прыкра.
Можа правільна жыць не ўмею?
Слых няшчырасць мне рэжа. Нязвыкла
Думаць, быццам яе разумею.
Не хачу, не магу я мяняцца
І пісаць па-ранейшаму буду!
Для чаго мне таіцца-хавацца,
Прывыкаць да душэўнага бруду?

Я такая, як ёсць, і даволі
На сябе прымяраць іншых маскі.
Не хачу бачыць скрытнасць на волі
І хлусіць дзеля нечае ласкі.
**2003г.**

**Мужу**

Не сумуй, што лепшую палову
Пражылі з табой, ды, можа стацца,
Яшчэ доўга з квеценню вясновай
Маладосць назад будзе вяртацца.
Яшчэ многа будзем мець  спатканняў
З майскім садам і зялёным гаем.
Хай душа не ведае змярканняў
І блакітам неба хай вітае.
А калі абрынуцца нягоды,
Падтрымаюць блізкія нам людзі.
На шляху жыццёвым мы заўсёды,
Любы мой, з табою побач будзем.
**2003г.**

*   *   *

Ад урачоў чакаюць паратунку.
Ад кухараў, напэўна, пачастунку.
Прыемных слоў ад  любых і спатканняў,
А ад паэткі вершаў, пажаданняў.

І я ў душы  сваёй шукаю словы
З паўнюткім зернем, без хлусні-паловы.
Каб выказаць  удзячнасць, захапленне
Усяму таму, што  дорыць мне натхненне.

Падобныя ўсе словы, віншаванні.

Як нашы лёсы, жыцці, скрыжаванні.
Адметныя радкі знайсці б хацела.
Калі б магла, калі б усё умела.

Гады ляцяць і іх ніяк не спыніш.
Не трэба думаць пра жыццёвы фініш.
Няхай душа спявае на прыволлі,
І будзе ў ёй радкам маім раздолле.
**2003г.**

**Раўнадушша**

Што можа быць больш крыўдным і балючым,
Чым раўнадушша блізкіх нам людзей.
Непараўнальны шчодрасць слоў гаючых
І чорствасць - без цяпла душы, надзей.

Нам дастаткова слова альбо фразы,
Каб свет пабляк ці зноў для нас расцвіў.
Мы чуйна адклікаемся адразу
На шчырасць слоў і сквапнасці парыў.

Нам хочацца, каб усё было прыгожа,
Каб песціў лёс і ліўся мёд ракой.
Ды не хапае часам такту, можа,
І бурым мір сваёю мы рукой.

А потым плачам, скардзімся, гаруем
Замест таго, каб заглянуць у твар
Людзей нам блізкіх, чый спакой руйнуем
І аднімаем крылы іхніх мар.
**2003г.**

*   *   *

Верш -- мой сябар у бессанні начэй,
Падзялюся і туга мінецца.
Так, як цяжка людзям без вачэй,
Так без вершаў сумна мне жывецца.

Вось дзівачка, скажа хтосьці з тых,
Для каго пісаць занятак марны.
Ім не трэба верш і "залаты",
Не цікавіць нават геніяльны.

Можа, так прасцей на свеце жыць,
Калі думкі нізенька лунаюць.
Толькі лепш дзівачкай ужо быць,
Дзівакоў чвмусь не забываюць.
**2004г.**

*   *   *

Застыла прырода ў  чаканні
Халоднай і снежнай зімы.
У восеньскім сумным маўчанні
Тугу адчуваем і мы.

Вясною  жыццё ажывае.
Нас радуе зноў харатсво.
І яркім, квітнеючым маем
Напоўняцца сэрцы цяплом.

Нас радуе звонкае лета,
Чарніцы, грыбы, сенажаць.
Жытнёвы прыгожы палетак
У сініх валошках мяжа.

І вось гаспадыняю -- восень,

Прырода ў чаканні  ізноў.
Далоў пазалоту і просінь –
Свой круг пачынае наноў.

Ад думкі на сэрцы тужліва,
Бягуць нашы дні і гады.
То весела і зіхатліва,
То поўныя смутку, нуды.
**2004г.**

## Поўня

Гадзіннік б’е. Сярэдзіна ўжо ночы.
У хаце ўсё відаць, нібы ў дзень.
Глядзіць мне поўня праз акно ў вочы,
Кранае твар святла яе прамень.

Чамусь не спіцца гэткай ноччу белай.
Я небам заварожаная зноў.
Любуюся, там зорачкі нясмела
Мігцяць, згараюць, успыхваюць наноў.

І думкі, як абрыўкі  сноў,  мільгаюць,
Мо  да нябёс сплываюць дні, гады?
Напэўна, таму зоркі й патухаюць,
Што вабіць поўні нас святло заўжды.
**2004г.**

## Навука

Захварэла смяротна старэнькая маці,
Знаць, нядоўга нябожчыку-мужу чакаць.
“І чаго ж ты сядзіш у пустой сваёй хаце?
Лепш прадай і ў нас будзеш  век дажываць”.

Моўчкі слухала маці  дачушку-крывінку.
І, згадзіўшыся, хату сваю прадала.
Туга грошы ўвязала ў насоўку-хусцінку,
І, змахнуўшы слязу, да  дачушкі пайшла.

Там, канешне, чакаюць любоў і спагада,
Прыбяруць ёй пасцель і пасадзяць за стол.
Толькі  ж нешта дачушка зусім ёй не рада,
Усё вочы хавае, глядзіць у вугол.

"Унас дзеці малыя, ты хворая цяжка,
Раптам іх ты заразіш хваробай сваёй.
На, вось хлеб і яшчэ малака табе пляшка,
Ты паеш на двары, там, на лаўцы  маёй."

Зразумела старая, чаму так няміла
Сустракае на ганку дачушка яе.
Гэта ж жартам сказала, што грошы згубіла,
Вось таму і гасціннасці  той  не стае.

Хлеб  на лаўку паклала нягледзячы, моўчкі...
Дом дачкі  стаў раптоўна нязвыкла чужым...
Ёсць яшчэ ў матулі  два  родных сыночкі,
Можа, "любаю" будзе таксама і ім?

Сын старэйшы  панура ўсё зіркаў на маці.
"Бач, рамонт тут у нас, самі спім абы дзе."
І ў малодшага  месца няма ёй у хаце,
Аб нязручнасцях розных гаворку вядзе.

Павярнулася маці, каб выйсці із хаты
Ды насустрач, з марозу, нявестка ўвайшла.
Твар прыемны, ласкавы, крыху вінаваты:
"У нас госці, а я... да суседкі пайшла.

Ды куды ж Вы, пабуддзьце. І ноч ужо блізка..."
Усміхнулася мужу: чаму не спыняў?

І схілілася ціха над люлькай-калыскай,
З якой светлавокі хлапчук пазіраў.

Муж збянтэжана буркнуў: “А што я – нічога...
Цесна бачыш, дзяцей ужо трое ў нас”.
Адступала старая ў кут, да парога –
“Выбачайце, пайду я, бо бачу, не ў час...”

Тут нявестка зірнула гняўліва вачыма:
“То навошта і мне іх тады гадаваць?
Каб вось так, уначы, за сыночка дзвярыма
Мне прыйшлося , як ёй, у парозе стаяць.

Лепш адразу , малога, у снег пад завею...”
І рашуча дастала з калыскі дзіця.
“Звар’яцела ці што? Не пасмееш!”
“Пасмею! Каб не зведаць і мне вось такога жыцця”.

Супакойся. Дзіцятка глядзіць во пужліва...
Зразумеў муж, што гэта навука была.
Заблішчэлі слязінкі, бы снег, зіхатліва,
За руку ўзяў матулю, падвёў да стала.

“Ты прабач мяне, мама. Прашу каб забыла
Усё тое,што я неабачна сказаў.”
А нявестка да сэрца сыночка туліла,
Яшчэ болей жаданым і любым ён стаў.
**2004г.**

**Я чакаю**
(песня)

Хор птушыны звініць, спявае,
Зелянеюць лугі, узмежкі.
У растанні вясна мінае
Без цябе, без тваёй усмешкі.

Я чакаю цябе, мой каханы,
Я сумую ізноў, мой адзіны.
Твой прыгадваю позірк адданы
І лічу да спаткання хвіліны.

А наўкола красуе лета,
Клічуць гай, сенажаць і поле.
Без цябе ўсё не ў радасці гэта
І самотна яшчэ мне болей.

Вецер восеньскі гоніць хмары
І ў дажджлівы, няўтульны вечар
Берагу ў сваім сэрцы мары
Аб шчаслівай з табой сустрэчы.
**2004г.**

**Ці даўно дзяўчынай маладзенькай**
(песня)

Ці даўно дзяўчынай маладзенькай
Бегла ў гай ты сцежкай зеляненькай.
Пад чаромхай белаю стаяла,
Зорнай ночкай хлопца цалавала.

Я гуляла з любым да світання.
Прычакала сэрцайка кахання.
І душы хацелася пяшчоты,
Хуткаплынны маладыя годы.

А чаму ж цяпер адна гуляеш,
І каго ў гаі тым шукаеш?
Хіба любы твой куды паехаў,
Ці знайшоў другую для ўцехаў?

Не гуляць з ім у гаі зеляненькім,

Бо навек застаўся маладзенькім.
Дзеля іншай ён мяне не кінуў,
На вайне каханы мой загінуў.
**2004г.**

**Беларусь**
(песня)

Апраніся ў заморскія строі,
Чужой мовай пачні гаварыць.
не прымусіш душу ў спакоі,
Без радзімай зямелькі пражыць.

Прыпеў:
Няма лепей маёй Беларусі,
Я Радзімай заўжды ганаруся.
І шукаць мне не трэба дарма,
Бо другое такое няма.

Гасцяваць можна ў розных краінах.
З хараства іх не зводзіць вачэй.
Толькі ў родных, знаёмых мясцінах
Беларускаму сэрцу лягчэй.

Прыпеў:
Колькі слоў самых чыстых, узнёслых
Прысвяцілі  Радзіме святой.
Я – імгненне адно з тваіх вёснаў,
Ты мой лёс, Беларусь, і спакой.
2005г.

**Сады Перамогі**
(песня)

Ружова-белым воблакам садоў
Перадваенны май зямлю акутаў.
Яшчэ байцы не зведалі баёў,
Ды прыбліжаўся час людскіх пакутаў.

Прыпеў
Квітнее сад вялікіх Перамог.
І ззяюць росы ў цёплых промнях сонца.
За боль і раны, горкі пыл дарог
Вам мой паклон , сівыя абаронцы.

Зямля гарэла, чорны слаўся дым,
Была яна крывёй байцоў паліта.
Змагаліся стары і малады,
Каб сад зацвіў, закаласіла жыта.

Кіпеннем пакалечаных садоў
Ажыў чаканы май у кожным сэрцы.
Не ўсе з вайны вярнуліся дамоў,
Каб мы жылі, прыйшлося ім памерці.
2005г.

Н.Кавальчук
ЛЕТУЦЕННІЦА

зборнік вершаў падрыхтаваны
ЦРБ імя В.Ф.Праскурава
Складанне, камп'ютарны набор Г.Пупач
Афармленне вокладкі С.Раковіч